# “Стоп! Я хачу памяняць акцёра”

**У рамках Фестывалю практычнай псіхалогіі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце быў арганізаваны псіхалагічны тэатр. Практычныя псіхолагі, што працуюць у сістэме адукацыі, выкладчыкі псіхалогіі, студэнты псіхалагічных факультэтаў, а таксама ўсе жадаючыя мелі магчымасць пабываць на незвычайных інтэрактыўных спектаклях, падчас якіх гледачы з лёгкасцю ператвараюцца ў рэжысёраў і акцёраў, а сцэнарый некалькі разоў мяняецца па ходу дзейства.**

## “Тэатр прыгнечаных, а не дэпрэсіўных”

Свае спектаклі ўдзельнікам фестывалю прадставілі Форум-тэатр факультэта міжнародных адносін БДУ і Сацыяльны інтэрактыўны тэатр "Тэт-а-тэт" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Нягледзячы на некаторыя тэхнічныя адрозненні, гэтыя тэатры кіруюцца ў сваёй дзейнасці аднолькавымі прынцыпамі, закладзенымі паўвека таму Аўгустам Баалем, і маюць адну мэту — дапамагчы людзям глыбей пазнаць сябе і навучыцца кантраляваць сваё жыццё, свае эмоцыі.



Кіраўнік тэатра "Тэт-а-тэт" Уладзімір Каляда вядзе форум.

У адрозненне ад традыцыйнага тэатра, дзе глядач амаль увесь час знаходзіцца ў пасіўным стане, у інтэрактыўным тэатры глядач актыўны — ён уцягнуты ў тую ж дзейнасць, што і акцёры. У сцэнарыі не даецца рашэння канфлікту, наадварот — ён максімальна абвастраецца. Кожная сцэна ў інтэрактыўным тэатры заканчваецца на піку канфлікту. Сутнасць прадстаўлення заключаецца ў сумесным пошуку выйсця са складанай жыццёвай сітуацыі. Знайсці рашэнне і паказаць яго на сцэне (а пры неабходнасці — і ў жыцці) — задача актыўных гледачоў інтэрактыўнага тэатра.

Любы спектакль гэтага тэатра ўнікальны і не падобны на папярэднія, бо кожны раз у ім бяруць удзел новыя гледачы, а значыць, дзейства ўзбагачаецца новым вопытам. На працягу некалькіх гадзін гледачы “пражываюць” прапанаваную сітуацыю, прапускаючы яе праз сябе і спрабуючы накіраваць развіццё падзей да лепшага.

Падчас спектакля дзеянне можа кардынальна мяняцца некалькі разоў. Калі гледачу не падабаецца сітуацыя, ён гаворыць: “Стоп! Я хачу памяняць акцёраў, словы, мізансцэну...”. І тады пачынаецца ўжо іншы спектакль.

Акрамя таго, што інтэрактыўны тэатр прыносіць рэальную карысць гледачам (а гэта, як правіла, пэўная мэтавая аўдыторыя з пэўнымі жыццёвымі праблемамі), ён дае бясцэнны вопыт акцёрам і рэжысёру: папершае — жыццёвы, выпакутаваны і “выкрышталізаваны” многімі людзьмі, а па-другое — тэатральны, бо даводзіцца шмат імправізаваць, дзейнічаць увогуле без сцэнарыя і пры гэтым быць праўдзівым у сваіх дзеяннях і пачуццях.

## "Ах, каханне!"

Спектакль пад такой назвай паказалі студэнты Сацыяльнага інтэрактыўнага тэатра "Тэт-а-тэт" Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (кіраўнік — Уладзімір Раманавіч Каляда). На працягу некалькіх хвілін яны разыгралі міні-прадстаўленне з некалькімі мізансцэнамі: вокамгненная сварка двух закаханых, якія ў роспачы на вачах адно ў аднаго завязваюць новыя бяздумныя сувязі, разбіваючы іншыя пары. Маладыя людзі здзяйсняюць свае ўчынкі хутка і бязлітасна, і здаецца, што ўжо нічога не выправіць...

Аднак спектакль заканчваецца стоп-кадрам, фінальная сцэна не завершана. Акцёры паказалі зараджэнне і развіццё канфліктнай сітуацыі да яе піка, а затым спынілі дзеянне, каб кожны з гледачоў задумаўся наконт таго, як можна было папярэдзіць канфлікт і як яго вырашыць цяпер.

> Заснавальнікам форум-тэатра з’яўляецца бразілец Аўгуст Бааль, які стварыў першы “Тэатр прыгнечаных”. Гэты чалавек разумеў, што людзі, прыгнечаныя тымі ці іншымі сацыяльнымі праблемамі, вельмі пакутуюць, аднак ім можна дапамагчы, калі змяніць іх уласнае стаўленне да гэтых праблем, а таксама іх паводзіны.

Увогуле, інтэрактыўны тэатр складаецца з дзвюх частак: спектакля і форуму. Прычым п’еса будуецца так, каб гледачы мелі магчымасць даследаваць прычыну няўдач герояў. Звычайна прапануюцца вядомыя сітуацыі, якія здараюцца з людзьмі на вуліцы, дома ў сям’і, на працы і на вучобе. У аснове сцэнарыя часта ляжыць чыя-небудзь асабістая гісторыя ці перажыты вопыт.

Форум мае на мэце ўдзел гледачоў у прадстаўленні. Ім прапаноўваецца змяніць кожную папярэднюю сітуацыю такім чынам, каб у далейшым трагедыі не адбылося. У ходзе форуму правяраецца мноства рашэнняў (чым больш, тым лепш), якія затым абмяркоўваюцца, але не з пункта гледжання “правільна — няправільна”, а з меркавання эфектыўнасці. Адна з асаблівасцей інтэрактыўнага тэатра — адсутнасць рэкамендацый, як героям трэба сябе паводзіць. Выбар заўсёды робіць сам чалавек, і ніхто не можа дакладна сказаць, як яму правільна паступіць у канкрэтнай сітуацыі.

Такім чынам, п’еса паказваецца двойчы. Першы раз гледачы проста праглядваюць яе, а падчас другога паказу маюць права ў любы момант спыніць дзеянне. Як толькі паяўляецца шанц выправіць сітуацыю і ў кагосьці з гледачоў узнікае ідэя, як гэта зрабіць, гучыць слова “Стоп!”, на імправізаваную сцэну выходзіць глядач і мяняе акцёра, паказваючы, як, на яго думку, трэба дзейнічаць.

Звычайна п’еса перапыняецца ўжо на першых секундах, і з гэтага моманту пачынаецца новая частка спектакля — форум, які можа доўжыцца 2-3 гадзіны. Зрэшты, працягласць форуму залежыць ад таго, наколькі цікавыя варыянты вырашэння праблем прапаноўваюць гледачы ў кожнай мізансцэне. Тут важнае месца адводзіцца псіхолагу, які вядзе форум-спектакль. Яму неабходна своечасова рэагаваць на дзеянні гледачоў, калі яны становяцца неэфектыўнымі ці паўтараюцца, тактоўна пераходзіць да наступнай мізансцэны ці ўвогуле спыняць спектакль.

Акцёры падыгрываюць гледачам, імправізуюць разам з імі, але ў той жа час не дазваляюць сітуацыі стаць ідэальна вырашальнай, што падштурхоўвае людзей шукаць усё новыя і новыя рашэнні. Пры гэтым гледачам, каб у іх не ўзнікла расчаравання ад дарэмнасці прапанаваных дзеянняў, тлумачыцца, што і ў жыцці праблемы проста так не вырашаюцца, і людзям у складанай сітуацыі цяжка змяніць свае паводзіны і стаць іншымі, для гэтага патрэбен час і галоўнае — жаданне.

Падчас форуму вельмі важна стварыць атмасферу псіхалагічнага і эмацыянальнага камфорту для гледачоў. “Ніводнае дзеянне не павінна крытыкавацца ці асуджацца, наадварот, іх трэба падтрымліваць апладысментамі, — гаворыць кіраўнік тэатра "Тэт-а-тэт" Уладзімір Раманавіч Каляда. — Такая дружалюбнасць дапамагае гледачам прапанаваць вялікую колькасць варыянтаў вырашэння сітуацыі. А гэта важна, бо ў інтэрактыўным тэатры няма адназначных адказаў на пытанні, як не можа быць адзінага варыянту вырашэння канфліктнай сітуацыі ў рэальным жыцці. Перавага інтэрактыўнага тэатра заключаецца ў тым, што ён дазваляе людзям прапусціць інфармацыю праз сябе і ўсвядоміць наступствы розных дзеянняў для будучыні”.

## Як утаймаваць хама?

Форум-тэатр факультэта міжнародных адносін БДУ (кіраўнік Мікіта Моніч) найбольш нагадвае Тэатр прыгнечаных Аўгуста Бааля. Ва ўсіх яго пастаноўках абавязкова ёсць прыгнятальнік і прыгнечаны — ахвяра.

Галоўнай тэмай форум-тэатра з’яўляецца сітуацыя прыгнёту і насілля ў разнастайных праявах: адносіны паміж членамі сям’і, саслужыўцамі, прадстаўнікамі розных нацый, культур і рэлігій, праблемы ВІЧ-інфіцыраваных, людзей з абмежаванымі магчымасцямі, пытанні, якія закранаюць наркаманію, алкагалізм, гандаль людзьмі і г.д.

Пастаноўка ў выкананні студэнтаў Мікіты Моніча і Кацярыны Вержбаловіч абвастрыла тэму хамства — непрыхаванага, брыдкага хамства маладога чалавека ў адносінах да дзяўчыны. Прычым акцёры сыгралі так, што ў пераважнай большасці гледачоў з’явілася непераадольнае жаданне хоць штосьці зрабіць і неяк паўплываць на хама. Яны спрабавалі ўмяшацца ў ход драмы і змяніць яго так, каб сітуацыя прыгнёту перастала быць небяспечнай і зневажальнай для ахвяры.

Выпрацаваць паспяховыя паводзіны ў бязвыхаднай, на першы погляд, сітуацыі — такая галоўная задача форум-тэатра. У адрозненне ад сацыяльнага інтэрактыўнага тэатра, дзе гледачы могуць замяніць любога акцёра, тут нельга мяняць прыгнятальніка: як і ў жыцці, мы можам мяняць толькі сябе і свае паводзіны. І выканаўцу галоўнай ролі (у нашым выпадку — хама) пры ўзаемадзеянні з гледачамі трэба пільна прытрымлівацца асаблівасцей характару свайго персанажа, а таксама адэкватна рэагаваць на ўсе дзеянні гледачоў. Гэта складана і патрабуе значнага вопыту.

Трэба сказаць, што тэхніка форум-тэатра можа прымяняцца ў розных сітуацыях. Яна дае магчымасць аказаць псіхалагічную дапамогу канкрэтнаму чалавеку, а таксама ў стане змяніць паводзіны людзей у дачыненні да сацыяльна прыгнечаных ці погляд грамадства на гэтую праблему.

Адметна, што інтэрактыўным тэатрам зацікавіліся многія ўдзельнікі фестывалю. Практычныя псіхолагі на ўласным вопыце пераканаліся, наколькі дзейснай і цікавай можа быць такая незвычайная форма ўзаемадзеяння з моладдзю.



Нават у самай складанай сітуацыі трэба шукаць выйсце.

**Галіна СІДАРОВІЧ.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**